Сумко, А.В. Фарміраванне кнігавыдавецкай сістэмы ў БССР на працягу 1920 — 1930 гг. / А. В. Сумко // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 157–159

*А. В. СУМКО*

# ФАРМІРАВАННЕ КНІГАВЫДАВЕЦКАЙ СІСТЭМЫ Ў БССР НА ПРАЦЯГУ 1920—1930 гг.

З першых дзён свайго існавання Савецкая ўлада адразу ўстанавіла кантроль над кнігавыдавецкай дзейнасцю праз стварэнне адпаведнай сістэмы дзяржаўных органаў. Кнігавыдавецкая справа з'яўлялася цэнтральным звяном ідэалагічнай палітыкі. Былі зачынены ўсе перыядычныя органы, якія выступалі з крытыкай знешняй і ўнутранай палітыкі бальшавікоў, асуджалі парушэнне імі дэмакратычных свабод. Адбывалася нацыяналізацыя друкар-



няў і цэнтралізацыя выдавецкай дзейнасці, што было характэрна для тагачасных пераўтварэнняў.

Першымі дзяржаўнымі выдавецтвамі на Беларусі ў паслякастрычніцкі перыяд былі выдавецтва «Звязда», выдавецтвы Белнацкама, Наркамасветы і іншых наркаматаў, Віцебскае і Гомельскае аддзяленні Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР. 1 студзеня 1921 г. пачало сваю працу Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі (ДВБ), галоўнымі задачамі якога стала рэгуляванне ўсёй выдавецкай дзейнасці ў БССР і забеспячэнне выпуску ўласных выданняў [1]. Пры ДВБ быў адкрыты аддзел перыядычнага друку, у які ўваходзілі прадстаўнікі ўсіх газет, што выдаваліся на тэрыторыі рэспублікі.

У сувязі са зменамі ў грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай палітыцы ўрада ў 1920-я гг. адбыліся вялізныя зрухі ў перабудове і пашырэнні выдавецкай справы ў рэспубліцы. У першую чаргу гэта было выклікана правядзеннем новай эканамічнай палітыкі, пад уплывам якой усе выдавецтвы былі пераведзены на гаспадарчы разлік, газеты — на платнае распаўсюджанне, дазваляўся свабодны гандаль і выкарыстанне прыватнага капіталу. У выніку сталі больш сур'ёзна адносіцца да запатрабаванняў спажыўцоў, вызначэння тыражу тых ці іншых твораў, падняліся патрабаванні да выдавецкай культуры.

У мэтах рэгулявання выдавецкай і газетнай справы на Беларусі, канцэнтрацыі сродкаў 8 снежня 1922 г. быў створаны Беларускі дзяржаўны трэст выдавецкай і паліграфічнай прамысловасці [2]. У 1922 г. пачало дзейнічаць кааператыўнае выдавецтва «Адраджэнне» (пасля «Савецкая Беларусь»), якое здолела сканцэнтраваць вакол сябе ўсіх беларускіх пісьменнікаў і амаль манапалізавала выпуск беларускамоўнай літаратуры.

Адначасова ў выдавецкай справе адбываліся ўзмацненне дзяржаўна-планавага пачатку і рэарганізацыя кіравання, што з'яўлялася сур'ёзнай перашкодай для эфектыўнай камерцыйнай дзейнасці выдавецтваў ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі. У гэты час пачала фарміравацца сістэма ўрадавага кантролю, дзе асноўную ролю адыгрывала створанае ў 1923 г. Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў. Яно рабіла папярэдні прагляд і аналіз перыёдыкі і кніжных выданняў з боку ідэалагічнай вытрыманасці і давала дазвол на права апублікавання, а таксама стварала адпаведныя спісы твораў друку, якія былі забаронены для гандлю і распаўсюджвання.

У 1924 г. Белтрэстдрук і выдавецтва «Савецкая Беларусь» былі аб'яднаны ў Беларускае дзяржаўнае выдавецтва (з 1933 г. Дзяржвыдавецтва БССР), якое стала буйнейшай установай рэспублікі — цэнтрам, які аб'яднаў выдавецкую, паліграфічную і камерцыйную дзейнасць.



У 1924—1926 гг. БССР былі вернуты 18 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў, выдавецтвы якіх былі ўключаны ў сістэму дзейнасці ДВБ.

Цэнтралізацыя кнігавыдавецкай справы працягвалася ў перыяд індустрыялізацыі і калектывізацыі. Спынілі дзейнасць перыферыйныя выдавецтвы. У снежні 1926 г. быў створаны Камітэт па справах друку і паліграфічнай прамысловасці пры СНК БССР, у функцыі якога ўваходзіла дзяржаўнае рэгуляванне гаспадарчай дзейнасці выдавецтваў і кантроль за работай паліграфічных прадпрыемстваў.

16 мая 1927 г. Сакратарыят ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб урэгуляванні выдавецкай справы рэспублікі. Асноўнымі выдавецтвамі, вакол якіх павінна была развівацца ўся кнігавыдавецкая дзейнасць, былі вызначаны Белдзяржвыдавецтва, Інбелкульт і рэдакцыйна-выдавецкі аддзел ЦСПСБ.

У пачатку 30-х гг. адбываецца рэарганізацыя Белдзяржвыдавецтва. У 1931 г. з яго выдзяляецца сектар тэхнічнай літаратуры, які ператвараецца ў самастойнае дзяржаўнае выдавецтва з непасрэдным падпарадкаваннем ВСНГ [3]. Акрамя гэтага, у складзе БДВ былі створаны сектары па галінах кніжнай

прадукцыі: партыйнай і палітмасавай, вучэбнай і педагагічнай, сельскагаспадарчай, дзіцячай і юнацкай, вайсковай і інш., якія праз пэўны час таксама пераўтвараюцца ў самастойныя выдавецтвы. Такім чынам, каб узмацніць кантроль з боку партыйных органаў за зместам выдаваемай літаратуры, у першай палове 30-х гг. была створана сістэма спецыялізаваных выдавецтваў.

У 1920—1930 гг. была знойдзена аптымальная мадэль кнігавыдавецкай сістэмы, якая цалкам адпавядала запатрабаванням урадавай палітыкі. Развіццё выдавецкай справы ў БССР адбывалася толькі на базе дзяржаўнага сектара. Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены ў жыцці грамадства змянілі характар кнігавыдавецкай справы. Калі раней большасць друкарняў належала прыватнаўласніцкаму сектару, то пачынаючы з другой паловы 20-х гг. XX ст. усталявалася дзяржаўная сістэма кнігадрукавання. Мэты новых уладальнікаў адрозніваліся ад імкненняў іх папярэднікаў, клопат аб прыбытку адышоў на другі план, кнігі перасталі быць проста таварам. Яны сталі моцным сродкам ідэалагічнага ўздзеяння.

---

1 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 238. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 2.

2 НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 318. Арк. 102.

3 Тамсама. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 42. Арк. 799.